**Чэчат В. У.** Сацыяльная палітыка у адносінах да сям'і і дзяцей у Беларусі // Народная асвета. 1998. № 1.

**Шевердин С. Н.** У опасной черты. М.: Педагогика, 1985.

**Ягодинский В. Н.** Школьнику о вреде никотина и алкоголя. Мн.: Народная асвета, 1986.

# БАЦЬКІ І ПАЎНАЦЭННАЕ ПАТОМСТВА

***В. У. ЧЭЧАТ,***
***загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі магістратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі, доктар педагагічных навук***

*Бацькі знаходзяць у дзецях вышэйшую уцеху, і у іх жа могуць знайсці выток пакут, расчараванняу, адчаю; усё будзе залежаць ад таго, правільна ці няправільна пойдзе фізічнае і нервова-псіхічнае развіццё дзяцей.*

М. І. Пірагоў

Паміж старэйшым і малодшым пакаленнямі пастаянна існуе вельмі цесная арганічная сувязь. Пры гэтым лёс адных цалкам адбіваецца на лёсе другіх. Шматлікія даследаванні і жыццёвы вопыт паказваюць, што здароуе, правільнае маральнае і інтэлектуальнае развіццё дзяцей — гэта аснова радасці, дабрабыту і жыццёвых сіл бацькоў. А хваравітасць, бяздарнасць і амаральнасць дзяцей — выток няшчасця бацькоў, іх аслабленага псіхафізічнага стану, заучаснай старасці і смерці.

Кожны бацька і кожная маці чакаюць ад сваіх дзяцей заусёды самага лепшага у фізічным, маральным, інтэлектуальным развіцці. Што ж трэба для таго, каб «спрагназіраваць», закласці у дзецях усё лепшае? Ці дастаткова, як прынята разважаць у псіхолага-педагагічнай літаратуры, толькі правільнага выхавання з першых дзён нараджэння дзіцяці? А можа, ёсць іншыя, больш фундаментальныя фактары і умовы?

Даследаванні у многіх галінах навук (філасофіі, псіхалогіі, генетыкі, педагогікі, фізіялогіі, медыцыны і інш.) і вопыт многіх пакаленняу сямей даюць магчымасць вылучыць некалькі такіх фундаментальных умоу. Першая умова для

нараджэння паўнацэнных дзяцей — беспамылкова складзены сямейны саюз, замацаваны толькі на чыстых памкненнях і каханні. Назіранні сведчаць аб тым, што найбольш трывалымі з'яўляюцца тыя шлюбы, якія заключаюцца ў адносна маладым узросце (19—25 гадоў). На жаль, у жыцці сустракаецца нямала сямейных саюзаў, якія заключаюцца з разлікам на матэрыяльны дабрабыт. Будучыя маці ці бацька імкнуцца як быццам да лепшага: клапоцяцца, каб іх дзецям жылося добра. Аднак у рэшце рэшт атрымліваецца, што абхітрыць прыроду яшчэ нікому не ўдавалася (subtilitas naturae subtilitatem hominis multo praeferat). Гатовы матэрыяльны дастатак без намаганняў — часцей за ўсё зло для дзяцей. Як сцвярджаў К. Дз. Ушынскі, толькі праца ёсць адзіна даступнае чалавеку на зямлі і адзіна вартае яго шчасце; магчымасць працы і любоў да яе — лепшая спадчына, якую могуць пакінуць сваім дзецям і бедны, і багаты.

Другая умова для нараджэння здаровых і паўнацэнных дзяцей — клопат будучых бацькоў аб чысціні сваёй крыві і адсутнасці хранічных захворванняў. Медыцынскія даныя сведчаць аб тым, што захворванні крыві, а таксама агульныя хранічныя захворванні перадаюцца дзецям у чыстай або відазмененай форме. І ў адным, і ў другім выпадку гэта прыводзіць да нараджэння аслабленага патомства, а нярэдка і да стану фізічнага выраджэння. Калі ў пачатку XX ст. найбольш небяспечнымі хваробамі бацькоў былі сіфіліс, падагра, то ў канцы стагоддзя — розныя віды захворванняў крыві, сэрца, страўнікава-кішачнай сістэмы, рак малочнай залозы, СНІД.

Трэцяя умова для нараджэння паўнацэнных дзяцей — клопат аб захаванні здаровай нервовай сістэмы. Менавіта стан нервовай сістэмы бацькоў адыгрывае важную ролю ў функцыяніраванні сям'і і перадачы спадчынных характарыстык. (Французскі псіхіятр Марэль упершыню распрацаваў вучэнне аб выраджэнні. Вядомы яго трактат аб фізічным, разумовым і маральным выраджэнні чалавечага роду.) Адчувальнасць нервовай сістэмы да шкодных уздзеянняў навакольнага асяроддзя прыводзіць да таго, што «для з'яўлення цяжкіх форм псіхафізічнага выраджэння не патрабуецца шмат часу, не патрэбны гады ці жыццё пакаленняў. Страшнае біялагічнае зло можа з'явіцца ў сваім поўным развіцці ў найбліжэйшым патомстве безумоўна здаровага да таго часу чалавека, калі толькі ён падвергся асабіста фізічным ці маральным уплывам, што шкодна ўздзейнічаюць на нервовую сістэму... Усё сказанае да-

тычыць у значна большай ступені нервовай сістэмы жанчыны, чым мужчыны...»[1].

Расстройства нервовай сістэмы адбываецца пад уплывам наступных асноуных фактарау: 1) стомленасць працай, 2) цяжкія хваробы, 3) фізічнае знясіленне, 4) душэуныя хваляванні, 5) ужыванне атрутных рэчывау. Надзвычай успрымальнай да разнастайных шкодных уздзеянняу аказваецца нервовая сістэма у перыяд свайго зародкавага развіцця. «З моманту зачацця жыццё, дабрабыт, будучае зачатай істоты і яе патомкау залежаць поунасцю ад харчавання, працы, напружанасці, фізічнага і маральнага лёсу маці. Стомленасць, знясіленне маці, розныя атрутныя рэчывы, якія яна ўжывала ў гэты час, ...з'яуляюцца значна больш згубнымі для плода, чым для маці, і могуць унесці пачатак выраджэння у гэту істоту і ў яе патомства»[2].

**Раім прачытаць**

**Дети и женщины Беларуси сегодня и завтра:** Национальный доклад о положении детей и женщин. Мн., 1995.

**Сикорский И.** Обязанности родителей предъ потомствомъ // Вѣстникъ воспитанія. 1890. № 2. С. 13—14.

**Чэчат В. У.** Педагогіка сямейнага выхавання. Мн.: НІА, 1995. С. 2—58, 100—115.

---

[1] Сикорский И. Обязанности родителей предъ потомствомъ // Вѣстникъ воспитанія. 1890. № 2. С. 13—14.

[2] Там жа.